# Абвешчаны дадатковы набор на 23 бюджэтныя месцы

**Абітурыенты ўстаноў вышэйшай адукацыі, якія не прайшлі на бюджэтную форму навучання, могуць паспрабаваць удачу яшчэ раз. Універсітэты абвясцілі дадатковы набор на вакантныя месцы.**

Сёлета незапоўненымі аказаліся толькі 23 бюджэтныя месцы (7 на дзённай форме навучання і 16 — на завочнай). Гэта ў 6 разоў менш, чым летась.

Дадатковы набор праводзіць Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А.Куляшова. Тут вакантнымі засталіся 6 месцаў па спецыяльнасці "Фізіка і інфарматыка" на дзённай форме навучання і 1 месца — па спецыяльнасці "Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны" на завочнай форме. У Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры прапаноўваецца 1 месца на дзённай форме навучання па спецыяльнасці "Спартыўна-педагагічная дзейнасць (трэнерская праца па парусным спорце)" і 7 — па гэтай жа спецыяльнасці на завочнай форме (напрамкі — трэнерская праца па вяслярным спорце (1), па плаванні (1), па лыжных гонках (1), па боксе (1), па хакеі на траве (2), па рукапашным баі (1)).

Дадатковы набор на завочную форму абвясцілі таксама Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт (па адным месцы па спецыяльнасцях "Аўтасэрвіс", "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве", "Сацыяльныя камунікацыі") і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту (3 месцы па спецыяльнасці "Арганізацыя перавозак і кіраванне на чыгуначным транспарце", 2 — па спецыяльнасці "Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва").

Прыём дакументаў у рамках дадатковага набору на вакантныя бюджэтныя месцы будзе праходзіць з 30 ліпеня па 1 жніўня.

**Падрыхтавала**
**Галіна СІДАРОВІЧ.**